**Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь**

# Аналітычная тыднёвая справаздача па выніках назірання: 15-21 чэрвеня 2020 года

*Назіранне за выбарамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца РПГА "Беларускі Хельсінкскі камітэт" і ПЦ "Вясна" ў рамках кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары".*

## Высновы

Выбарчая кампанія праходзіць на фоне рэзкага пагаршэння агульнай сітуацыі з правамі чалавека ў краіне, у сітуацыі няспынных рэпрэсій у дачыненні да грамадзян, у тым ліку непасрэдных удзельнікаў выбарчага працэсу, што падтрымлівае атмасферу страху ў грамадстве;

18 чэрвеня стала вядома аб затрыманні супрацоўнікамі ДФР КГК патэнцыйнага кандыдата ў Прэзідэнты, аднаго з найбольш заўважных удзельнікаў сёлетняй выбарчай кампаніі, Віктара Бабарыкі і кіраўніка ягонай ініцыятыўнай групы Эдуарда Бабарыкі. Пазней стала вядома, што Генеральнай пракуратурай Рэспублікі Беларусь была ўзбуджаная крымінальная справа па ч.2 і 3 арт 285 КК (Стварэнне злачыннай арганізацыі ці ўдзел у ёй). Абодва затрыманыя знаходзяцца ў СІЗА КДБ. Раней таксама былі затрыманыя сябры ініцыятыўнай групы С. Купрэева і У. Дудараў. Праваабарончая супольнасць краіны прызнала В. Бабарыку і затрыманых сябраў ягонай ініцыятыўнай групы палітвязнямі і запатрабавала іх неадкладнага вызвалення;

16 чэрвеня стала вядома аб узбуджэнні ў дачыненні да кіраўніка ініцыятыўнай групы С. Ціханоўскай, блогера Сяргея Ціханоўскага яшчэ адной крымінальнай справы па арт. 191 КК (перашкоды ажыццяўленню выбарчых правоў, права на ўдзел у рэферэндуме, альбо рэалізацыі права заканадаўчай ініцыятывы грамадзянам, альбо рабоце Цэнтральнай выбарчай камісіі). Вядома, што дадзеная справа была ўзбуджаная па асабістай заяве старшыні ЦВК Л. Ярмошынай;

19 чэрвеня скончыўся этап збору подпісаў выбаршчыкаў ініцыятыўнымі групамі па вылучэнні кандыдатаў у Прэзідэнты. Трое з вылучэнцаў, Н.

Кісель, А. Таболіч і Ю. Губарэвіч, заявілі аб спыненні свайго далейшага ўдзелу ў выбарах;

назіральнікі кампаніі працягваюць паведамляць аб выкарыстанні адміністратыўнага рэсурсу пры зборы подпісаў за вылучэнне кандыдатам дзеючага кіраўніка дзяржавы А. Лукашэнкі – збор подпісаў пры непасрэдным удзеле адміністрацыі арганізацый, прадапрыемстваў і ўстаноў на іх тэрыторыі, у тым ліку і ў працоўны час;

пры правядзенні вулічных пікетаў па зборы подпісаў за вылучэнне кандыдата А. Лукашэнкі іх арганізатары не абмяжоўваліся выключна зборам подпісаў, але і абмяркоўвалі іншыя пытанні, якія закранаюць інтарэсы грамадзян. Пры гэтым ніякіх заўвагаў з боку праваахоўных органаў і выбарчых камісій да іх не было, што сведчыць аб селектыўных падыходах да вулічных пікетаў па зборы подпісаў па вылучэнні тых ці іншых кандыдатаў;

назіральнікі кампаніі працягваюць атрымліваць адмовы ад ТВК у праве назіраць за працэдурамі праверкі подпісаў;

аналізуючы сітуацыю, якая склалася ў краіне і ўмовы правядзення выбараў у цэлым, эксперты кампаніі “Праваабаронцы за свабодныя выбары” лічаць, што створаныя ўмовы правядзення сёлетняй выбарчай кампаніі несумяшчальныя з міжнароднымі стандартамі свабодных і дэмакратычных выбараў, заснаваных на роўнай канкурэнтнай палітычнай барацьбе.

**Агульная сітуацыя**

Адной з асноўных падзеяў у справаздачны перыяд стала затрыманне 18 чэрвеня супрацоўнікамі ДФР КГК адной з самых заўважных асоб, якая вылучаецца ў якасці кандыдата ў Прэзідэнты на сёлетніх выбарах – Віктара Бабарыкі, а таксама і кіраўніка ягонай ініцыятыўнай групы Эдуарда Бабарыкі.

Паводле кіраўніка КГК, В. Бабарыка быў затрыманы ў сувязі з тым, што з'яўляўся непасрэдным арганізатарам супрацьпраўнай дзейнасці, спрабаваў ўздзейнічаць на сведкаў, схаваць сляды раней учыненых злачынстваў. Пазней стала вядома, што Генеральнай пракуратурай Рэспублікі Беларусь была ўзбуджаная крымінальная справа па ч.2 і 3 арт. 285 КК (Стварэнне злачыннай арганізацыі ці ўдзел у ёй).

Пра падставы для затрымання Эдуарда Бабарыкі афіцыйна не паведамлялася. На дадзены момант вядома, што Віктар і Эдуард Бабарыкі знаходзяцца ў СІЗА КДБ, В. Бабарыку прад'яўлена абвінавачванне. Раней былі затрыманыя і ўзятыя пад варту сябры ініцыятыўнай групы Віктара Бабарыкі – Святлана Купрэева і Уладзімір Дудараў.

Гэтым затрыманням папярэднічалі затрыманні ў межах распачатай крымінальнай справы ў дачыненні да супрацоўнікаў "Белгазпрамбанка" і шэраг пагрозаў кіраўніка дзяржавы ў адрас В. Бабарыкі, а таксама блакіроўка ягонага выбарчага фонда[1], якую аналітыкі кампаніі расцанілі як адвольнае выкарыстанне карнага інструментарыя праваахоўных органаў, якое кардынальна абцяжарыць дзейнасць прэтэндэнта і кандыдата і рэальна абмяжуе яго магчымасці

Затрыманне В. Бабарыкі выклікала значны грамадскі рэзананс. Беларускія праваабарончыя арганізацыі ў супольнай заяве прызналі затрыманне В. Бабарыкі і чатырох сябраў ягонай ініцыятыўнай групы палітычна матываваным і запатрабавалі іх неакладнага вызвалення.[2]

Да вызвалення В. Бабарыкі заклікаў у сваёй заяве ЕС[3].

Эксперты кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары" адзначаюць, што затрыманне В. Бабарыкі і сябраў ягонай ініцыятыўнай групы стала вынікам рэпрэсіўнай кампаніі, разгорнутай уладамі краіны з самага пачатку выбараў. За паўтары месяцы сотні грамадзянаў краіны, у тым ліку непасрэдныя ўдзельнікі выбарчай кампаніі, былі падвергнутыя рэпрэсіям: адміністратыўным арыштам і штрафам, звальненням з працы і інш. Кіраўнік ініцятыўнай групы С. Ціханоўскай, блогер Сяргей Ціханоўскі і сямёра ягоных паплечнікаў знаходзяцца ў СІЗА па ўзбуджанай крымінальнай справе і таксама былі прызнаныя беларускімі праваабаронцамі палітычнымі зняволенымі. Пры гэтым да арыштаваных і ўзятых пад варту асобаў не дапускаюць адвакатаў, падвяргаюць іх жорсткаму і бесчалавечнаму абыходжанню і катаванням.[4]

16 чэрвеня стала вядома, што ў дачыненні да Сяргея Ціханоўскага ўзбуджаная яшчэ адна крымінальная справа па арт. 191 КК (перашкоды ажыццяўленню выбарчых правоў, права на ўдзел у рэферэндуме, альбо рэалізацыі права заканадаўчай ініцыятывы грамадзянам, альбо рабоце Цэнтральнай выбарчай камісіі). Вядома, што дадзеная справа была ўзбуджаная па асабістай заяве старшыні ЦВК Л. Ярмошынай.[5]

Напярэдадні, Святлана Ціханоўскага заявіла, што ёй пагражалі невядомыя ў сувязі з яе ўдзелам у выбарах.[6]

19 і 20 чэрвеня ў Мінску і ў іншых гарадах краіны адбыліся пікеты салідарнасці, у якіх прынялі ўдзел тысячы грамадзян. Нягледзячы на відавочна мірны характар сходаў 20 чэрвеня адбыліся масавыя затрыманні, у шэрагу выпадкаў з

[1] https://elections2020.spring96.org/be/news/97651
[2] http://spring96.org/be/news/97703
[3] https://news.tut.by/elections/689525.html
[4] http://spring96.org/be/news/97629
[5] http://spring96.org/be/news/97617
[6] https://elections2020.spring96.org/be/news/97599

прымяненнем фізічнай сілы, удзельнікаў пікетаў прадстаўнікамі спецпадраздзяленняў МУС. У выніку да 200 грамадзян былі затрыманыя.[7]

У сувязі са значным пагаршэннем агульнай сітуацыі з правамі чалавека ў краіне 17 чэрвеня ПЦ "Вясна" і РПГА БХК звярнуліся да шэрагу спецкадакладчыкаў і Вярхоўнага камісара па правах чалавека ААН з супольным зваротам з просьбай у межах існуючых працэдур звярнуцца да Урада Рэспублікі Беларусь аб прыняцці неадкладных мер па выкананню сваіх міжнарожных абавязацельстваў у галіне правоў чалавека.[8]

Не пазней 19 чэрвеня ініцыятыўныя групы па вылучэнні кандыдатаў у Прэзідэнты павінны былі здаць падпісныя лісты для правядзення праверкі ў раённыя, гарадскія, раённыя ў гарадах выбарчыя камісіі.

Такім чынам, 19 чэрвеня скончыўся чарговы выбарчы этап кампаніі – збор подпісаў выбаршчыкаў. На дадзены момант вядома, што трое з асобаў, якія вылучаліся ў якасці кандыдатаў заявілі аб спыненні свайго далейшага ўдзелу ў выбарах; гэта Наталля Кісель, Аляксандр Таболіч і Юры Губарэвіч.

## Збор подпісаў

Працягваўся збор подпісаў у падтрымку вылучэння кандыдатамі ў Прэзідэнты; як адзначылі назіральнікі, найбольшую актыўнасць праявілі ініцыятыўныя групы В. Бабарыкі, С. Ціханоўскай і В. Цапкалы. Акрамя таго, у многіх гарадах былі актыўнымі сябры ініцыятыўнай групы С. Чэрэчня, а таксама сустракаліся пікеты па зборы подпісаў за вылучэнне Г. Канапацкай і А. Дзмітрыева. Ю. Губарэвіча. А. Казлоў і В. Кавалькова таксама правялі некалькі пікетаў, у тым ліку - «Пікет салідарнасці» ўвечары 18 чэрвеня.

Сябры ГА «Белая Русь», БРСМ і Федэрацыі прафсаюзаў у апошні тыдзень збору подпісаў правялі серыю пікетаў у розных гарадах у падтрымку вылучэння кандыдатам у прэзідэнты А. Лукашэнкі, дзе разам са зборам подпісаў «прадстаўнікі ініцыятыўнай групы адказвалі на пытанні грамадзян па розных напрамках жыцця і жыццядзейнасці раёна. Там жа былі ўсталяваныя закрытыя урны. У іх жыхары раёна пакідалі свае прапановы і наказы дзеючаму Кіраўніку дзяржавы»[9]. Сайт «Белай Русі» папярэдне абяцаў[10], што «ўсё самае важнае з пачутага і запісанага будзе прааналізавана і перададзена ўверх па вертыкалі. З найбольш складанымі пытаннямі будзе разбірацца асабіста Прэзідэнт».
Пікеты праўладных актывістаў не абыйшліся без парушэнняў: як паведамляе сайт «Белай Русі», прадстаўнікі ініцыятыўнай групы А. Лукашэнкі ў працэсе збору

[7] http://spring96.org/be/news/97718
[8] https://spring96.org/be/news/97624
[9] https://belayarus.by/news/vybory-prezidenta-respubliki-belarus-2020/minsk-moskovskiy-rayon-odnoimennyy-rynok/
[10] https://belayarus.by/news/vybory-prezidenta-respubliki-belarus-2020/dve-skhozhie-novosti-s-vitebshchiny/

падпісаў падаравалі маладой пары, якая паабяцала паставіць свае подпісы, «фірмовы белы парасон ад «Белай Русі»[11]. Выбарчым кодэксам забаронена ўзнагароджанне выбаршчыкаў за ўнясенне подпісу; парушэнне гэтага патрабавання можа быць падставай для адмовы ў рэгістрацыі альбо адмены рашэння аб рэгістрацыі кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь.

Эксперты кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары" адзначалі, што ўдзельнікі пікетаў па зборы подпісаў карыстаюцца правам свабодна абмяркоўваць грамадска-палітычныя пытанні. Аднак улады, дэманструючы падвойныя стандарты, востра рэагуюць на такі свабодны фармат пікетаў, толькі калі гаворка ідзе пра пікеты па зборы подпісаў у падтрымку незалежных кандыдатаў, але пакідаюць без увагі фармат правядзення пікетаў у падтрымку дзеючага кіраўніка дзяржавы.

Шматлікія ўдзельнікі перадвыбарных пікетаў апазіцыі, якія не парушалі грамадскі парадак, былі пакараныя штрафамі і адміністрацыйнымі арыштамі, некаторыя - неаднаразова. Апошнія пікеты па зборы подпісаў, якія 19 чэрвеня прайшлі ў Мінску і ў многіх іншых гарадах краіны (Магілёве, Светлагорску, Маладзечна, Гомелі, Віцебску ды інш.) і скончыліся масавымі затрыманнямі, часцяком з адвольным або непрапарцыйным ужываннем супрацоўнікамі міліцыі сілы і спецыяльных сродкаў. Як паведаміў ПЦ "Вясна"[12], у Мінску былі затрыманыя больш за 150 чалавек, ў Бабруйску – больш за 10, каля 10 – у Гомелі і Наваполацку. Сярод затрыманых – не менш за 10 журналістаў; у дачыненні да вялікай колькасці затрыманых складзеныя пратаколы па адміністрацыйнаму артыкулу 23.34 КаАП за парушэнне парадку правядзення масавых мерапрыемстваў. Некалькі затрыманых былі змешчаны ў ІЧУ.

У пятніцу 19 чэрвеня завяршыўся прыём падпісных лістоў тэрытарыяльнымі выбарчымі камісіямі. Паведамленняў ад назіральнікаў аб перашкодзе здачы або адмове ў прыёме падпісных лістоў на працягу тыдня не паступіла.
19 чэрвеня каардынатары і сябры ІГ В. Бабарыкі звярнуліся[13] ў ЦВК з просьбай забяспечыць прынящце падпісных лістоў з больш чым 30 000 подпісаў у адсутнасць затрыманых В. Бабарыкі і кіраўніка яго ІГ Эдуарда Бабарыкі: у сувязі з іх затрыманнямі, а таксама ў сувязі з тым, што ў асобных раёнах Беларусі адсутнічаюць каардынатары ІГ, немагчыма выканаць[14] патрабаванні ч. 14 арт. 61 ВК, у адпаведнасці з якімі здаць падпісныя лісты ўпаўнаважаны толькі кіраўнік ініцыятыўнай групы або асоба, якая вылучаецца ў якасці кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь. Ініціатыўная група В. Бабарыкі здала 365 000 з 435 000 сабраных подпісаў[15].

[11] https://belayarus.by/news/vybory-prezidenta-respubliki-belarus-2020/bobruyskaya-tvorcheskaya-initsiativa/
[12] http://spring96.org/be/news/97718
[13] https://babariko.by/news/my-hotim-chtoby-vse-podpisi-popali-v-czik
[14] http://spring96.org/ru/news/97335
[15] https://babariko.by/

Кіраўнік ініцыятыўнай групы па вылучэнні кандыдатам у Прэзідэнты А. Лукашэнкі М. Арда 19 чэрвеня паведаміў[16], што ўсяго група №1 сабрала каля 2 000 000 подпісаў, 60% з якіх – па месцы жыхарства людзей, а 40% – на прадпрыемствах і ў пікетах.
В.Цапкала паведаміў аб 160 000 пададзеных подпісах[17].

Назіральнікі кампаніі працягваюць паведамляць аб выкарыстанні адміністрацыйнага рэсурсу пры зборы подпісаў за вылучэнне кандыдатам у Прэзідэнты дзеючага кіраўніка дзяржавы А. Г. Лукашэнкі: збор подпісаў ажыцяўляецца з удзелам адміністрацыі арганізацый, прадпрыемстваў і ўстаноў, непасрэдна на іх тэрыторыі, ў тым ліку ў працоўны час.
Напрыклад, Сяргей Нікіцін, які працаваў зваршчыкам на БелАЭС, заявіў, што 1 чэрвеня працаўнікам на 2-й энергаблок прынеслі запоўненыя падпісныя лісты ў «прарабскую» і прапанавалі ўсім падпісацца за А. Лукашэнку. Ён і многія іншыя адмовіліся паставіць свой подпіс. Падпісныя лісты былі запоўненыя на кампутарах, у некаторых унесены дадзеныя старых пашпартоў. 16 чэрвеня, прыехаўшы з вахты ў Гродна, Сяргей Нікіцін накіраваў электронную скаргу ў ЦВК па гэтым факце.

## Умовы назірання

ТВК працуюць, як правіла, у памяшканнях мясцовых органаў улады і кіравання, куды зараз ў сувязі з эпідэміяй коронавируса уваход для наведвальнікаў абмежаваны. Такім чынам, назіральнікі не заўсёды могуць пераканацца ў тым, што дзяжурства ў камісіях вядзецца па графіку.

Назіральнікаў, якія былі акрэдытаваныя ў Маладзечанскай раённай выбарчай камісіі, 19 чэрвеня  сакратар камісіі Семеж Аксана Валянцінаўна не дапускала ў кабінет выбарчай камісіі, тлумачыўшы тым, што зараз не адбываецца пасяджэнне камісіі і назіральнікам няма чаго там рабіць. На просьбу праінфармаваць іх аб колькасці падпісных лістоў, якія былі здадзеныя кожнай з ініцыятыўных груп, яна паведаміла толькі спіс груп.

Назіральнікам, якія накіравалі ў камісіі звароты з патрабаваннем забяспечыць магчымасць назіраць за працэсам праверкі падпісных лістоў, працягваюць прыходзіць адказы з адмовамі, сэнс якіх зводзіцца да таго, што назіральнік мае права прысутнічаць на пасяджэнні камісіі, а правоў прысутнічаць пры працэсе праверкі падпісных лістоў, які праводзіцца да пасяджэння камісіі, заканадаўствам не прадугледжана. Такія адказы атрымалі назіральнікі з Ленінскай раённай ў г. Гродна, Светлагорскай раённай, Рэчыцкай раённай, Бярозаўскай раённай, Ленінскай раённай г. Брэста і некаторых іншых выбарчых камісій. Некаторыя назіральнікі атрымалі няпэўныя адказы аб тым, што будуць запрошаныя на

[16] https://1prof.by/news/obshhestvo-i-profsoyuzy/za-vydvizhenie-aleksandra-lukashenko-kandidatom-v-prezidenty-podpisalis-poryadka-dvuh-millionov-chelovek/
[17] https://news.tut.by/economics/689527.html

пасяджэнне камісій, аднак яны лічаць, што працэс праверкі подпісаў пройдзе як звычайна, да правядзення пасяджэння, а на пасяджэнні ТВК будуць толькі абвешчаныя яе вынікі (Барысаўская раённая камісія); таксама некаторых назіральнікаў запрасілі на пасяджэнне па праверцы подпісаў непасрэдна пасля заканчэння часу прыёму падпісных лістоў 19.06 у 19.00 (Смаргонская раённая камісія).

Варта падкрэсліць, што менавіта ад таго, як арганізаваны працэс адбору падпісных лістоў для праверкі, ці выключаецца ціск на людзей, якія падпісаліся за вылучэнне кандыдата, залежыць вынік праверкі, а ў цэлым – вынікі вылучэння кандыдата.